# Раздзел V

# КУЛЬТУРА Ў ФОКУСЕ СМІ

## ЧАСОПІС «ВЕРЕСК» ЯК З'ЯВА Ў НАЦЫЯНАЛЬНАЙ МАСТАЦКАЙ КРЫТЫЦЫ

***В. М. Адамава***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*adamovadamik@gmail.com*

*Навуковы кіраўнік – Л. П. Саянкова-Мяльніцкая,*
*доктар філалагічных навук, прафесар*

У артыкуле разглядаецца гомельскі часопіс «Вереск» як медыяз'ява ў пэўным сацыякультурным кантэксце і вопыт транфармацыі досведу Л. С. Выгоцкага як тэатральнага крытыка.

***Ключавыя словы:*** медыяз'ява; сацыякультурныя перадумовы; напрамкі мастацкай крытыкі; псіхалогія мастацтва.

## ЖУРНАЛ «ВЕРЕСК» КАК ЯВЛЕНИЕ В НАЦИОНАЛЬНОЙ ХУДОЖЕСТВЕННОЙ КРИТИКЕ

***О. Н. Адамова***

*Белорусский государственный университет,*
*ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,*
*adamovadamik@gmail.com*

*Научный руководитель – Л. П. Саенкова-Мельницкая,*
*доктор филологических наук, профессор*

В статье рассматривается гомельский журнал «Вереск» как медиаявление в определенном социокультурном контексте и опыт транформации мастерства Л. С. Выготского как театрального критика.

***Ключевые слова:*** медиаявление; социокультурные предпосылки; направления художественной критики; психология искусства.

Часопіс «Мастацтва», спецыялізаванае грамадска-асветніцкае выданне пра выяўленчае мастацтва, фатаграфію, музыку, тэатр, кіно, які ў 2023 г. адзначыў 40-гадовы юбілей (выдаецца з 1983 г., да 1992 г. – часопіс «Мастацтва Беларусі»), на сваіх старонках звяртаецца да пытанняў асэнсавання мастацтвазнаўчага вопыту: аўтарамі часопіса даследуецца гісторыя развіцця мастацкай крытыкі. Варта, на наш погляд, пашыраць досвед зацікаўленых медыятворцаў у пытаннях гісторыі развіцця мастацтвазнаўчай думкі ў Рэспубліцы Беларусь з мэтай вызначэння арганізацыі сучаснай інфармацыйнай прасторы не толькі як інтэрпрэтатара надзённых падзей культурнага жыцця, але і як падмурка для далейшых мастацтвазнаўчых даследаванняў. У такім аспекце, на наш погляд, можна разглядаць гомельскі часопіс «Вереск», стваральнікам якога з'яўляецца савецкі псіхолаг Леў Семёновіч Выгоцкі (1896–1934).

Перыядычны друк у Гомелі з'явіўся на пачатку XX ст. У дарэвалюцыйны час у горадзе выдавалася 14 газет (усе на рускай мове): «Гомельский правовой листок» (1901), «Гомельский вестник» (1909–1910), «Гомельское слово» (1911–1912) і іншыя. Найбольшай інтэнсіўнасць выдавецкая дзейнасць прыпадае на 1909–1911 гады, калі «у гамельчан была даволі ўстойлівая цікавасць да тэатра» [1, с. 44]. Амаль у кожнай мясцовай газеце існаваў спецыяльны раздзел – «Тэатр і музыка». У крытыцы выпрацоўваецца шаблон рэцэнзіі-справаздачы пра тое, як прайшоў спектакль. «Блочная», неіндывідуальная форма рэцэнзіі падпарадкоўвалася абавязковаму кампазіцыйнаму плану артыкула: пераказ сюжэта п'есы, некалькі слоў пра ігру акцёраў, адпаведнасць абсталявання і касцюмаў і абавязкова – пра паводзіны глядзельнай залы» [1, с. 43]. У 1914 г. выйшла тры нумары літаратурна-тэатральнага часопіса «Гомельский музыкально-драматический вестник», яго ствальнікі (адзін з іх С. Л. Захарын, бацька якога меў уласную друкарню), імкнуліся больш разгорнута,чым гэта дазвалялі межы газетных артыкулаў, выказвацца па праблемах, якія іх хвалявалі. Выданне часопіса было спынена пасля мабілізацыі С. Л. Захарына. Дадзеныя сацыякультурныя перадумовы з'явіліся, на нашу думку, прычынай звароту Л. С. Выгоцкага да выдавецкай дзейнасці. У 1919–1921 гг. Л. С.Выгоцкі загадваў спачатку тэатральным пададдзелам Гомельскага аддзела народнай адукацыі, затым мастацкім аддзелам, апублікаваў больш за восемдзесят тэатральных рэцэнзій у газетах «Палеская праўда» і «Наш панядзелак».

Часопіс «Вереск» выйшаў 22 мая 1922 г. З шаснаццаці старонак часопіса дзевяць былі аддадзены разнастайнай рэкламе: аб кнігарнях і крамах, рэстаранах «Эльдарада» і «Уніён» і інш. Таксама ў часопісе быў размешчаны рэпертуар двух гомельскіх тэатраў – ім. М. І. Калініна і ім. Я. М. Свярдлова.

Рэдакцыйны артыкул «Вереск» можна разглядаць як своеасаблівы маніфест дадзенага выдання. Паколькі ў нумары часопіса пазначана, што яго рэдактарам з'яўляецца Л. С. Выгоцкі, то з высокай доляй верагоднасці можна сцвярджаць, што і аўтарства тэксту рэдакцыйнага артыкула належыць менавіта яму. «На вокладцы нашых лятучых лістоў мы напісалі: верас – сухі, бедны і суровы колер; трава дзікая, горкая і жабрачка; але зялёная вечна – аднолькава зімой, як летам; якая пакрывае велізарныя раўнінныя стэпы і зелянее ў горах. Скажам сціснла: у мастацтве цяпер так, што яму да твару не лаўр, а верас» [2, с. 7]. Л. С. Выгоцкі разглядае мастацтвазнаўчы часопіс як асяродак мастацкай культуры, без якога не можа прафесійна развівацца мастацтва. У рэдакцыйным артыкуле пазначаны тры асноўныя вектары, якія вызначаюць, на думку аўтара, напрамкі мастацкай крытыкі. Па-першае, гэта неабходнасць стварэння мастацкага асяроддзя («паветра»), па-за якім немагчыма існаванне творчасці. Па-другое, гэта раскрыццё асаблівасцяў успрымання мастацтва як асаблівага, «зваротна-творчага» акта, што, у сваю чаргу, дазваляе рэалізаваць і адмысловую адукацыйную функцыю мастацкай крытыкі па фармаванні культурных нормаў (узораў) мастацкага ўспрымання. Па-трэцяе, гэта стварэнне агульнага інфармацыйнага кантэксту, які датычыцца штодзённай практыкі мастацкага жыцця. Працэс успрымання мастацтва разглядаецца Л. С. Выгоцкім «як своеасаблівае "музіцыраванне", "вышчыпванне" музыкі, якую павінен пачуць чытач, "гуляючы па нотах" твора: "вышчыпваць" тоны на ўнутраным, не дадзеным інструменце, чуючы "вухам душэўным" магутную і сумную мелодыю – такі лёс крытыка» [3, с. 90]. Такім чынам, на думку Л. С. Выгоцкага, пазіцыя крытыка заключаецца ў аказанні асаблівай дапамогі чытачу, гледачу ў абуджэнні таго творчага стану, якое неабходна для паўнавартаснага перажывання мастацкага твора.

Рэцэнзіі на спектаклі, размечаныя ў часопісе «Вереск», на думку даследчыкаў, сталі падмуркам далейшага навуковага вывучэння мастацтва і былі штуршком да стварэння працы «Псіхалогія мастатцва» (1925 г.): «Тэатральныя рэцэнзіі Выгоцкага перыяду 1920-х гг. мала вя-

домы сучаснаму чытачу. Тым часам, яны ўяўляюць сабой несумнеўную каштоўнасць не толькі для мастацтвазнаўства, але і для псіхалогіі. У іх яскрава выступаюць вытокі некласічнай псіхалогіі і культурна-гістарычнай канцэпцыі. Ужо ў самых ранніх работах Выгоцкага аб тэатры дастаткова выразна праявілася агульная логіка, якая вызначае метадалагічную своеасаблівасць культурна-гістарычнага падыходу, якая пазней будзе рэалізавана ў яго фундаментальных псіхалагічных даследаваннях» [3, с. 93].

Гомельскі часопіс «Вереск» сёння выклікае цікаваць даследчыкаў спадчыны Л. С.Выгоцкага. Так ў 2023 г. ў Бразіліі выйшла ўнікальнае выданне з аднайменнай назвай, прысвечанае стагоддзю часопіса на партугальскай і рускай мовах. Выданне азначана як «Эцюды аб культурна-гістарычнай перспектыве Выгоцкага». Як міжнароднае выданне па псіхалогіі яно падтрымліваецца Фондам Л. С. Выгоцкага (Расія) і прапануе распаўсюдзіць працы, якія вывучаюць і паглыбляюць тэарэтычную спадчыну Льва Сямёнавіча Выгоцкага.

Ствараючы мастацкі часопіс, Л. С. Выгоцкі імкнуўся ўсвядоміць уласны вопыт інтэрпрэтацыі мастацкага (драматычнага) твора, стварыць нагоду да далейшага даследавання мастацтва з пункту гледжання псіхалогіі. Такім чынам, гомельскі часопіс «Вереск» у гісторыі мастацкай нацыянальнай крытыкі мэтазгодна, на нашу думку, разглядаць не толькі як медыяз'яву ў пэўным сацыякультурным кантэксце, але і як вопыт трансфармацыі досведу крытыка ў грунтоўныя навуковыя даследаванні.

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Мальцаў У. М.* Кропля камень тачыла. Тэатральная крытыка Гомеля пачатку стагоддзя // Мастацтва. 1997. №1. С. 43–45
2. «Вереск», 1922 // Культура и искусство: электронные коллекции Национальной библиотеки Беларуси. URL: https://digital.nlb.by/items/show/2163 (дата обращения: 26.05.2025).
3. *Собкин В. С.*, *Мазанова В. С.* О чем рассказал гомельский «Вереск» Льва Выготского: опыт реконструкции социокультурного контекста // Вопросы психологии. 2014. № 6. С. 89–106.